**Тарасевіч К.Т. (Мінск)**

# Выданні Максіма Танка ў прыватных выдавецтвах

Уклад Максіма Танка ў развіццё беларускай літаратуры немагчыма пераацаніць. Толькі пры ягоным жыцці было выдадзена каля 20 паэтычных зборнікаў, не ўлічваючы яшчэ аднаго дзясятка кніг выбраных вершаў, тры прыжыццёвыя зборы твораў, зборнікі паэзіі для дзяцей і казкі, успаміны і шматлікія пераклады з розных моў. Як адзначалі даследчыкі, ягоная паэзія па-дзіцячы наіўная і афарыстычна мудрая. Іранічная і самаіранічная. На дзіва свабодная, на фоне тагачаснай гісторыі. Магчыма, найцікавейшая паэзія сваёй эпохі [9, с. 5]. Амаль усе кнігі Максіма Танка з'явіліся ў дзяржаўных выдавецкіх арганізацыях (найбольшая колькасць – у выдавецтве «Мастацкая літаратура»). Аднак нельга недаацэньваць ролю прыватных выдавецтваў у станаўленні таленту паэта, бо дзякуючы ім, пабачылі свет некалькі выданняў аўтара, якія сталі значнай падзеяй у гісторыі беларускага прыгожага пісьменства.

Савецка-польская вайна 1920 г. завяршылася падпісанай без удзелу беларускіх палітыкаў Рыжскай мірнай дамовай 1921 г., паводле якой велізарная частка нашай краіны была далучаная да Польшчы. Упершыню з'явіўся тэрмін «Заходняя Беларусь». Дзяржаўная мяжа прайшла зусім побач з Полацкам, Менскам і Слуцкам. «Сэрцам Заходняй Беларусі» стала Вільня – неафіцыйная палітычная, культурная і навуковая сталіца адрэзаных земляў. Беларускі нацыянальны камітэт да 1938 г. каардынаваў адсюль дзейнасць заходнебеларускіх грамадскіх арганізацый і ўстаноў [1, с. 362].

Акурат у гэты перыяд у Вільні адбывалася станаўленне паэтычнага голасу маладога ўдзельніка беларускага нацыянальна-вызваленчага руху Максіма Танка. Першым яго магутны талент заўважыў Рыгор Раманавіч Шырма, які стаў фактычным выдаўцом першых зборнікаў паэта. Натуральна, выданне гэтых кніг адбывалася нелегальна, бо польскія ўлады ўвесь час рабілі захады, каб абмежаваць, а ў перспектыве і цалкам знішчыць беларускі нацыянальны рух.

Першым пабачыў свет зборнік «На этапах», выдадзены з дапамогай КПЗБ у 1936 г. у друкарні І. Баеўскага. Туды ўвайшлі вершы, напісаныя цягам чатырох гадоў (1932–1936). Гэта была невялікая кніга з зялёнай вокладкай, аформленая вельмі проста: у самой кнізе не было ніякіх ілюстрацый, акрамя партрэта аўтара, а на вокладцы быў змешчаны малюнак Міхала Сеўрука (ён жа з'яўляецца афармляльнікам многіх беларускіх кніг пачатку XX ст.), які не толькі глыбока, таленавіта перадаваў унутраны і ідэйны сэнс Танкавай паэзіі, але і даваў сінтэзаваны вобраз Заходняй Беларусі перыяду рашучага наступу рэакцыі. Паліцэйскі штык над дахамі вёсак, над шляхамі сімвалізаваў няволю і бяспраўе [5, с. 16].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рыгор Раманавіч Шырма прадчуваў, што ўлады не даруюць жыцця зборніку і наўрад ці ўдасца выручыць затраты на яго друкаванне, але ён разумеў і другое, а менавіта, што гэтая кніга стане этапнай з'явай у гісторыі заходнебеларускай літаратуры, незалежна ад таго, калі яе канфіскуюць – адразу пасля выхаду ці крыху пазней. Так паэзія Танка была выдадзена на грошы, якія інтэлігент Васіль Труцька ахвяраваў Шырме для выдання сабраных ім беларускіх песень. Больш за тое, ахвярадаўца пагадзіўся паставіць на вокладцы сваё прозвішча ў якасці адказнага выдаўца [7, с. 71]. Як і думаў Рыгор Раманавіч, увесь наклад у хуткім часе канфіскавала паліцыя, аднак удалося выратаваць некалькі асобнікаў.

У зборніку «На этапах» былі змешчаны ўрыўкі з паэмы «Нарач». Неўзабаве яна выйшла асобнай кнігай. Простая ў сваім афармленні (светлая цвёрдая вокладка, ніякіх малюнкаў, акрамя партрэта аўтара ў самым пачатку) паэма была надрукавана ў віленскай Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны ў 1937 годзе, у якасці адказнага выдаўца пазначаны часопіс «Калоссе». Якім накладам выйшла кніга, дакладна не вядома.

У гэтым жа годзе ў віленскай друкарні Я. Левіна пабачыў свет другі паэтычны зборнік Максіма Танка «Журавінавы цвет». Адказнымі выдаўцамі сталі Ф. Стэцкевіч і Р. Шырма. Зноў жа, унутранае афармленне кнігі было вельмі простым і сціплым: ніякіх малюнкаў, акрамя фотаздымка паэта на пачатку кнігі (партрэт такі ж, як у «Нарачы»). Афармленнем вокладкі займаўся вядомы мастак Язэп Горыд. Увогуле, у паэзіі Танка журавінавы колер набыў значэнне сімвала. Журавінавы – чырвоны. «Журавініць песняй Беларусь» – уздымаць людзей на змаганне, сеяць ідэі сацыялістычнай рэвалюцыі. Вокладка павінна была раскрываць змест кнігі. Аднак Горыд не ўспрыняў паэтаву думку-вобраз адпаведна і не знайшоў яму выяўленчага эквівалента. Афармляючы кнігу, ён імкнуўся перадаць маладую сілу, буйнасць, глыбіню паэзіі аўтара праз вобраз «п'янага» сонцам і дажджом залатога калосся. У дадатак, пад малюнкам Горыд дэкаратыўна раскідаў крыху стылізаваныя кветкі журавін. Кампазіцыю вырашыў у трох колерах: чорным, жоўтым і чырвоным (дамінуючым). На жаль, агульны знешні мастацкі выгляд кнігі ўсё ж застаўся недастаткова выразным. Нездарма выклікаў у Максіма Танка лёгкую скруху. «Вокладка мне не вельмі падабаецца, хоць і рабіў яе наш выдатны мастак Горыд» [5, с. 67], – запісаў аўтар зборніка ў дзённіку ад 26 ліпеня 1937 года.

Выданнем чацвёртага паэтычнага зборніка «Пад мачтай» займаўся асабіста Рыгор Раманавіч Шырма. На вокладцы ён быў пазначаны як адказны выдавец. Грошай на друк не хапала, частку сабрала «Беларускае культурнае згуртаванне ў Варшаве». Рэшту грошай, неабходных на выданне зборніка, даў адзін з членаў «Товажыства пшыяцюл наук», варта было толькі паэту паказаць карэктуру

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

набранага зборніка [5, с. 161]. Кніга была выдадзена ў Вільні ў 1938 г. у максімальна простым афармленні: звычайная светлая цвёрдая вокладка, ніякіх ілюстрацый знутры, нават партрэт аўтара не быў надрукаваны. Якім накладам выйшла кніга, дакладна не вядома.

17 верасня 1939 г. савецкія войскі пачалі вызваленне Заходняй Беларусі. Ужо напрыканцы месяца ўсе раней страчаныя землі былі далучаныя да БССР. Як вядома, у 1920-я гг. прыватных выдавецтваў у Савецкай Беларусі не існавала. Іх стварэнне не было магчымым і пазней, пасля прыняцця «Палажэння пра дзяржаўныя і грамадскія выдавецтвы» (студзень 1930 г.), ягонага ідэалагічнага дадатку (пастановы «Аб узмацненьні працы Галоўліта па паліткантролю за выпушчаемым пэрыядычным і непэрыядычным друкам» ад 15 жніўня 1931 г.), а таксама паступовай ліквідацыі прыватных выдавецтваў у іншых краінах СССР [2, с. 33]. Таму ў перыяд з 1939 па 1991 гг. усе кнігі Максіма Танка паспяхова выдаваліся ў дзяржаўных выдавецтвах.

Пасля распаду СССР, нягледзячы на раптоўнае павелічэнне долі прыватных выдавецтваў на беларускім кніжным рынку, амаль усе зборнікі Максіма Танка, шматлікія перавыданні і зборы твораў з’яўляліся ў дзяржаўных выдавецтвах. Аднак у 2012 г. у прыватным выдавецтве «Логвінаў» невялікім накладам у 500 асобнікаў пабачыў свет зборнік са ста выбранымі вершамі паэта. Гэта першая кніга з адмысловай серыі Валянціна Акудовіча «Я кнігу маю», задачай якой стала напоўніць паліцы ўсіх кнігарняў краіны, а таксама паліцы аматараў добрых кніг адметнымі творамі сучаснай і класічнай беларускай літаратуры [8]. Зборнік быў выдадзены ў фармаце покетбука. Укладальнікам стаў А. Хадановіч. Дызайн вокладкі дадаткова раскрывае сэнс назвы, а таксама, у нейкай ступені, мэту выдання (аўтар ідэі Тарас Куба): дзве тлустыя сінія лініі на белым фоне (міжвольна ўзнікае асацыяцыя з андрэеўскім крыжом, але ў дадзеным катэксце яна выпадковая), кніга нібыта перакрэслена. «Андрэй браў тэксты, якія прэзентуюць Танка-філосафа, Танка-лірыка, у якіх няма ні слова пра партыйныя білеты ці камунізм, – кажа Валянцін Акудовіч. – Максім Танк, не зважаючы на адданасць камуністычным ідэалам, – гэта сапраўды нацыянальны паэт. Па-другое, ён быў вельмі еўрапейскім паэтам і, па-трэцяе, Танк быў першым пасляваенным паэтам-інтэлектуалам. Гэта яго вельмі вылучала сярод іншых паэтаў, якія не змаглі адысці ад вясковых каранёў» [8]. Такія якасці і імкнуўся падкрэсліць укладальнік. Таму зборнік атрымаў назву «Абвяржэнне».

Такім чынам, у станаўленні Максіма Танка як паэта прыватныя выдавецтвы адыгралі вялікую ролю: яны сталіся першымі і апошнімі (пакуль што) выдавецкімі таварыствамі, якія пазнаёмілі грамадскасць з творамі паэта, а таксама з лепшымі вершамі за ўвесь яго творчы шлях (зборнік «Абвяржэнне»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У цяжкі час, калі беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі знішчаўся, дзякуючы зацікаўленым людзям з'явілася магчымасць друкавацца і далей развіваць магутны талент. Аўтар атрымаў добрую стартавую пляцоўку, дзе кнігі ствараліся не дзеля прыбытку, а дзеля саміх кніг, дзеля ідэі, таму, нягледзячы на адсутнасць належнага фінансавання, нелегальна, невялікімі накладамі ўсё ж з'яўлялася якасная літаратура, афармленая сціпла, але густоўна, у традыцыях нашаніўскага перыяду пачатку XX ст.

Зрэшты, нельга недаацэньваць значнасць прыватных выдавецтваў у сучаснай Беларусі. Вельмі часта кнігі, якія з'яўляюцца там, – гэта не толькі адкрыццё маладых і таленавітых, але і перавыданні класікі, якія раскрываюць творчасць аўтара з іншага боку. Яскравым прыкладам з'яўляецца «Абвяржэнне» М. Танка, выдадзенае ў прыватным выдавецтве «Логвінаў». «У гэтую кнігу ўвайшлі толькі 100 вершаў, але тыя, што з пэўнасцю "даехалі да нашчадкаў". Тыя, што належаць да корпусу найлепшай паэзіі XX стагоддзя – і, безумоўна, будуць цікавыя чытачам у XXI. У зборніку няма вершаў, якія нас з-пад палкі прымушалі вучыць у школе. Але і школьнікам гэтая кніга прыдасца: напрыклад, каб паказаць настаўнікам класнага паэта, якога яны яшчэ не ведалі» [9, с. 5], – пазначыў у прадмове ўкладальнік.

Літаратура


1. Арлоў, У. Краіна Беларусь. Вялікае княства Літоўскае : ілюстраваная гісторыя / тэкст У. Арлоў; мастак З. Герасімовіч. – Bratislva : Kalligram, 2012. – 397с.

2. Гужалоўскі, А.А. Палітычны кантроль выдавецкай дзейнасці ў БССР у 1920–1930-я гг. / А.А.Гужалоўскі // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 5 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 29–37.

3. Калеснік, У.А. Паэзія змагання: Максім Танк і заходнебеларуская літаратура / У.А. Калеснік. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1959. – 252 с.

4. Кляшчук, В. У Мінску адбылася прэзентацыя кніжнай серыі «Я кнігу маю» выдавецтва «Логвінаў» / В. Кляшчук [Электронны рэсурс]. – 20.02.2013. – Рэжым доступу : http://by.belapan.by/archive/2013/02/20/by_media_logvinau. – Дата доступу : 28.06.2014.

5. Ліс, А. На разломе эпохі / А. Ліс // Полымя. – 2000. – № 9. – С. 150–166.

6. Ліс, А. Пякучай маланкі след / А. Ліс. – Мінск : Маст. літаратура, 1981. – 116 с.

7. Ліс, А. Пётра Сергіевіч / А. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 88 с.

8. Мікулевіч, С. «Абвяржэнне» Максіма Танка / С. Мікулевіч [Электронны рэсурс]. – 19.09.2012. – Рэжым доступу : http://budzma.by/news/abvyarzhenne-maksima-tanka.html. – Дата доступу : 28.06.2014.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. Танк, М. Абвяржэнне: сто выбраных вершаў / М. Танк; уклад. А. Хадановіч; паслямова А. Бахарэвіча. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2012. – 132 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ